ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 58 (440) Пятніца, 27 мая 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск. Комсам. 25.

Адно з двух

У адным з нумароў нашай газэты былі надрукаваны выtрымкі з ноты ўраду СССР ураду Англіі з прычыны нячуванага злачынства Лёнданскай паліцыі і кіруючага ёю міністэрства ўнутраных спраў.

Яшчэ раз цьвёрдалобых удахнавіцеляў ангельскай палітыкі насьцігнула горкае разачараваньне. Яшчэ раз сарваны іх любімыя мары—дабіцца, каб англа-савецкія адносіны былі парваны і пры тым парваны па ініцыятыве ураду СССР.

Разрыў між двума буйнейшымі дзяржавамі Эўропы быў-бы ўспрыняты ўсім сьветам, як агульна-чалавечая катастрофа, як шалёны скачок у бяздоньне, на дне якога разгорнецца новая крывавая вайна. Нават агалцелыя ангельскія цьвёрдалобыя не адважваюцца ўзяць на сябе фармальную адказнасьць у гэтым пытаньні, яны не адважваюцца першымі заявіць аб разрыве.

Цьвёрдалобыя пасылаюць войска ў Кітай, іх агенты наладжваюць фашысцкія перавароты ў суседніх з намі дзяржавах. У сваім друку яны не перастаюць сеяць панічныя чуткі і ствараюць атмосфэру, з якой раджаюцца войны. Словам, яны выкарыстоўваюць усе шляхі і магчымасьці для арганізацыі новай вялічэзнай бойні.

Але ўсё гэта робіцца ці за кулісамі, ці пад тым ці іншым «безабідным» прадлогам,—як, напрыклад, адпраўка ангельскіх войск у Кітай, якая, бачыце, праводзіцца выключна «для абароны знаходзячыхся там ангельскіх грамадзян». Прадпрыняць-жа які-небудзь адкрыты крок на шляху да вайны для цьвёрдалобых вельмі рыскована: яшчэ жыва памяць аб 1914—1918 г. г. у галовах нават самых затхлых абывацеляў Англіі.

Цьвёрдалобыя ня хочуць узяць на сябе пачын разрыву англо-савецкіх адносін. Але яны ўсімі сіламі стараюцца стварыць такія абставіны, пры якіх гэты пачын прышлося-б зрабіць ўраду СССР.

Такой была адна з галоўных мэтаў паліцэйскага налёту на Аркос і нашае гандлёвае прадстаўніцтва ў Лёндане. Але як і пры ўсіх папярэдніх провакацыях падобнага роду, цьвердалобыя і на гэты раз папярпелі плачэўны правал.

Савецкі ўрад адмовіўся «пайсьці на сустрэч» іх дамаганьням, ён не захацеў давесьці справу да трагічнай разьвязкі, ён не дапусьціў, каб дзесяткі мільёнаў працоўных абодвых краін расплачваліся за дзікарскую выхадку ангельскага міністэрства ўнутраных спраў.

Але разам з тым наша нота ставіць рубам тое пытаньне, якое ангельскі ўрад усяляк імкнецца затушаваць,—пытаньне аб адказнасьці за далейшыя ўзаемаадносіны паміж Англіяй і СССР. Нота патрабуе, каб урад Англіі проста і адкрыта заявіў: ці жадае ён прадаўжэньня гэтых адносін, ці іх разрыву.

На гэтае пытаньне ня можа быць двухсэнсавага адказу.

Калі ангельскі ўрад жадае захаваць офіцыйныя адносіны з намі, дык з такім жаданьнем,—па прызнаньню саміх ангельскіх газэт,—зусім не саўмесьціма паўтарэньне інцыдэнтаў, падобных маючаму ў сучасны момант месца ў Лёндане. Калі-ж ц ь в ё р д а л о б ы я жадаюць разрыву, дык няхай гэта прызнаюць адкрыта, і тады кожны ангельскі рабочы і нават кожны ангельскі абывацель будзе ведаць з першаісточніку, куды яго вядуць седзючыя зараз на чале ўлады авантурыстыя.

Пытаньне пастаўлена рубам.

Жэнеўская конфэрэнцыя зачынілася

Конфэрэнцыя магла-б дасягнуць большых вынікаў

(З прамовы тав. Асінскага)

23-га мая закончыла сваю працу міжнародная экономічная конфэрэнцыя. Перад зачыненьнем конфэрэнцыі з прамовай выступіў старшыня Савецкай дэлегацыі, тав. Асінскі.

Вясна ў Лёндане.



Каханьне ўтраіх...

Тав. Асінскі зазначыў, што конфэрэнцыя дасягнула-б значных і рэальных посьпехаў, каб ухваленыя ёю пастановы і пажаданыя ў іх практычныя захады здолелі вырашыць хоць некаторыя супярэчнасьці сусьветнае экономікі ў інтарэсах рабочае клясы і палегчыць пераход да новае эпохі сусьветнае гаспадаркі.

„Каб дасягнуць гэтае мовы,—сказаў Асінскі,—трэба было-б ухваліць 11 пунктаў савецкае дэлегацыі; аднак прапановы савецкае дэлегацыі адхілены, а большая частка пытаньняў, закранутых гэтымі прапановамі, нават не абмяркоўвалася конфэрэнцыяй. Прадстаўнікі капіталізму спрабуюць праз нязначныя зьмены эканамічнае і сацыяльнае палітыкі палегчыць сусьветныя эканамічныя перашкоды ў напрамку стабілізацыі капіталізму. Савецкая дэлегацыя гаварыла аб існаваньні двух сыстэм народнае гаспадаркі. Зроблены ў гэтым напрамку крок нават пры яго маларашучым характары зьяўляецца адным з посьпехаў, дасягнутых канфэрэнцыяй.

Асінскі далей заявіў, што ў агульнай рэзалюцыі ёсьць правільныя пастановы па канкрэтных пытаньнях, асабліва формула аб мірным супольным існаваньні ўсіх краёў, незалежна ад эканамічных сыстэм гэтых краёў, але адначасна ёсьць палажэньні і канкрэтныя пастановы, з якімі ня можа згадзіцца савецкая дэлегацыя.

У зьвязку з гэтым, савецкая дэлегацыя ўстрымліваецца ад галасаваньня, не жадаючы ствараць ніякіх фармальных перашкод да ажыцьцяўленьня ўсіх пастаноў, з якімі згаджаецца СССР. Свае адмоўныя адносіны да асобных частак рэзолюцыі савецкая дэлегацыя выказала галасаваньнем проці адпаведных частак пры першым чытаньні рэзалюцыі.

„Мы ніводнага разу ня бачылі магчымасьці,—сказаў нарэшце Асінскі,—далучыцца да прапаноў аб перадачы тых ці іншых даручэньняў тым ці іншым органам Лігі Нацый. Мы ў Лігу Нацый не ўваходзім і ня думаем увaходзіць. Ліга Нацый у яе сучасным выглядзе зьяўляецца ня зброяй спакою, а зброяй ажыцьцяўленьня інтарэсаў камандуючых імпэрый сьвету, фіранкаю, якая завешвае гвалт над слабымі народамі. Мы пакідаем за сабою права шукаць іншых шляхоў для пагоджаньня з іншымі дзяржавамі нашых дзеяньняў у галіне ажыцьцяўленьня рэзалюцый, на якія мы згаджаемся".

Супынім апэтыт цьвёрдалобых

(Рэзолюцыя—протэст Клімавіцкай комсамоліі аб правакатарскім нападзе Лёнданскай жандармэрыі на Савецкае гандлёвае прадстаўніцтва).

Заслухаўшы інфармацыю аб наглым правакатарскім нападзе Ангельскай жандармэрыі на наше «Торгпредство» у Лёндане, Конфэрэнцыя Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Клімавіцкага раёну, Калінінскай акругі, ад імя 800 комсамольцаў рашуча протэстуе супроць новых правакатарскіх выпадаў імпэрыялістых, накірованых супроць СССР, супроць рабочых і сялян СССР і яго ўраду праводзячага палітыку міра.

Ангельскія консэрватары, фашысцкі ангельскі ўрад, удушачы працоўных Англіі, катуючы рабочых і сялян Кітаю, зьдзекваючыся над прасторамі калёній паднавольных Англіі, правацыруюць новыя бойкі, правацыруюць новыя імпэрыялістычныя захваты.

Конфэрэнцыя ад імя 800 комсамольцаў патрабуе ад нашага ўраду прыняцьця рашучых мер да прымушэньня ўзарваўшыхся ангельскіх лёрдаў і капіталістых і іншых краін уважаць правы рэспублікі рабочых і сялян.

Комсамолія Клімавіцкага раёну запэўне КПБ і Урад рабочых і сялян сваёй рыхтоўнасьцю ўліцца ў шэрагі сталёвае Чырвонае Арміі і зброяў прымусіць капіталістых выбіць іх захватніцкія апэтыты.

Англа-Савецкія адносіны пад пагрозай разрыву

Перамогі рэволюцыйных войск у Кітаі

Абыдземся і бяз Англіі

З гутаркі з нам. старшыні ВСНГ СССР А. П. Сераброўскім.

У пляне індустрыялізацыі нашага Саюзу Англія займае ня першае і ня другое месца,—гаворыць тав. Сераброўскі.—Мы больш прыстасоўваемся да Нямеччыны і Амэрыкі, галоўным чынам, таму, што Амэрыка дае нам лепшыя ўзоры як па тэхніцы, так і па організацыі вытворчасьці. Рацыяналізуючы нашу вытворчасьць, мы карыстаемся тэхнічным прыкладам Амэрыкі. У гэтых адносінах Амэрыка цікавіць нас больш усяго.

Прыступаючы да нашага новага будаўніцтва, мы, натуральна, імкнемся да таго, каб яно было ўзброеным і таму, што праэктуючы новыя вялізныя заводы хоць бы мэталюргічнай прамысловасьці (Тельбескі, Магнітогорскі, Керчанскі і др.), мы павінны браць за ўзор лепшыя з заводаў гэтага роду ў Амэрыцы.

Англія ў гэтай галіне ня можа даць нам узораў. Абсталяваньне яе мэталюргічных заводаў застарэлае. Аб гэтым гаворыць хоць бы вялікі сабекошт чыгуна, балванкі, гатунковага жалеза ў параўнаньні з сабекоштам заводаў Бэльгіі, Францыі, часткова Нямеччыны, ангельскія цэны вышэй.

Карыстаючыся зараз амэрыканскімі ўзорамі для заводаў нашай чорнай мэталюргіі, радзячыся з амэрыканскімі інжынэрамі, мы натуральна і абсталяваньне для гэтых заводаў возьмем у Амэрыцы ці Нямеччыне. Нямеччына ў апошні час працуе на амэрыканскі манэр і абсталяваньне, якое там будуецца, мала чым адрозьніваецца ад амэрыканскага.

Англія прадстаўляе для нас некаторы інтарэс у галіне машынабудаўніцтва, але ўсё-ж такі наша новае машынабудаўніцтва мы будзем рабіць па амэрыканскаму ўзору. З Амэрыкі-ж мы будзем выпісваць, галоўным чынам, варштаты-такарныя, фрэзэрныя, аўтаматы і інш. Часткова мы будзем купляць іх і ў Нямеччыне.

Пры пабудове нашых машынабудаўнічых заводаў—Сьвярдлоўскага, Ростаўскага, Сталінскага трактарнага і іншых—мы таксама ня будзем карыстацца ангельскімі ўзорамі. Праўда, у Англіі досыць добрыя варштаты, але яны даражэй нямецкіх, а па якасьці ня лепшыя нямецкіх і куды горшыя амэрыканскіх. Ва ўсякім выпадку, пры выбары варштатаў мы будзем браць варштаты „Нортрона", „Цынцынаці", „Леблон", „Акмэ", „Броун-Шарп" і іншых амэрыканскіх конструкцый ці „Людвіга Бевэ", „Альфрэда Шютте" і іншых нямецкіх канструкцый. Усё гэта вядомыя сусьветныя маркі.

Ангельцы пакуль могуць даваць нам толькі тое, што яны добра ўмеюць рабіць. Гэта—паравыя турбіны, паравыя катлы, электрычнае абсталяваньне, тэкстыльныя машыны, часткова буравое нафтавае абсталяваньне, але ўсё гэта асабліва вялікага значэньня для нас ня мае.

Зразумела, мы ацэньваем добрыя ангельскія машыны ў тых вытворчасьцях, у якіх мы да іх прызвычаіліся, і мяняць іх ня хочам, таму што гэта будзе каштаваць нам дорага.

Мы ня шукаем разрыву з Англіяй, але калі абставіны нашых гандлёвых з ёю адносін будуць нясприяючымі, мы ня будзем у яе нічога купляць. Мы пойдзем у другую краму, дзе прыказчык далікатны, а тавар ня горшы. З гэтага пункту погляду мы і падыходзім да пытаньня аб закупках у Англіі абсталяваньня для нашай прамысловасьці і ўсіх іншых патрэбных нам тавараў.

Да пагрозы разрывам мы адносімся спакойна, бо ня бачым у ім ніякай страты для сябе. Для нас гэта пытаньне ня першай важнасьці.



Балерына ангельскага пасла.

Тав. Сераброўскі разам з тым паведаміў лічбы, якія характарызуюць нашы гандлёвыя звароты з Англіяй за апошнія гады. За ўвесь 1924-25 г. мы вывезьлі ў Англію розных тавараў на 185 з паловай мільёнаў руб., а ўвезьлі амаль на 108 мільёнаў руб. У 1925—26 г. —вывезьлі на 187 мільёнаў рублёў а ўвезьлі на 126 мільёнаў руб. У першым паўгодзьдзі бягучага 1926-27 г. вывезьлі на 112 з паловай мільёнаў рубл., а ўвезьлі на 48 з паловай мільёнаў руб.

Разьмяшчэньне заказаў СССР у Англіі спынена.

Народны камісар Гандлю СССР Мікаян 21-га мая даў загад гандлёваму прадстаўніцтву СССР у Англіі ўстрымацца ад разьмеркаваньня новых заказаў сярод ангельскіх прамыслоўцаў.


Пастанова ўраду Англіі аб разрыве з СССР.

У палаце вобшчын Бальдвін заявіў, што ўрад ухваліў, калі толькі палата не выкажа сваёй нязгоды ў чацьвер, парваць гандлёвую згоду, патрабаваць адазваньня гандлёвае дэлегацыі і савецкай місіі з Лёндану і адазваць ангельскую місію з Масквы (гучныя воплескі на лаўках консэрватараў).

Спатканьне Чан-Кай-Шы з ангельскім пасланьнікам.

Ангельскі пасланьнік у Пэкіне Майльс-Лемпсон заявіў, што мэтай яго падарожжа на поўдзень Кітаю зьяўляюцца непасрэдныя перамовы з Нанкінскім урадам, для уладжаньня Нанкінскага інцыдэнту.

Як паведамляе друк, спатканьне адбудзецца у Шанхаі. Для гэтае мэты, у Шанхай ужо прыбыў Чан-Кай-Шы. Ангельскі-ж пасланьнік у Пекіне Майльс Лэмпсон і Ангельскі прадстаўнік ў Ханькоў—Ньютон, знаходзяцца ў падарожжы да Шанхаю.



Шукаюць рынкаў у СССР.

Некалькі дзён таму назад народнага камісара замежнага і ўнутранага гандлю СССР Мікаяна наведваў італьянскі пасол у Маскве Чэруці. У часе спатканьня Чэруці ўзьняў пытаньне аб магчымасьці пашырэньня савецкіх заказаў у Італіі. У сваім адказе Мікаян адзначыў цьвёрды намер савецкага ўраду ў адпаведнасьці з пастановай СНК СССР аб мерах да забясьпечаньня нормальнага ходу опэрацый па замежным гандлі, пашырыць імпортныя опэрацыі ў Італіі, у выпадку дачы Саюзу ССР доўгатэрміновых крэдытаў на выгадных для яго ўмовах.

У той-жа дзень Мікаяна наведаў аўстрыйскі пасланьнік Поль, ў зьвязку з пастановай аўстрыйскага ўраду аб гарантаваньні ім крэдытаў па савецкіх заказах, якое нядаўна было ўхвалена, а таксама дачы крэдытаў для той-жа мэты венскім муніцыпалітэтам.

Мікаян паведаміў Полю, што пытаньне аб аўстрыйскіх крэдытах разглядаецца ў НКГандлю.

Рэволюцыйны Ухан перамагае.

У барацьбе з ненавістным імпэрыялістам рэволюцыйным уханскім урадам буржуазны друк, асабліва ангельскі, за апошні час пачаў ужываць новы мэтад. Буржуазныя тэлеграфныя агенцтвы «ўласныя корэспондэнты» буржуазных газэт за апошнія дні трубілі ва ўсе трубы аб поўным паражэньні **Ухана**, аб разлажэньні арміі ўханскага ўраду, аб паніцы ў Ханькоў і г. д. Адно буржуазнае тэлеграфнае агенцтва нават дагаварылася да таго, што Ханькоў паў ужо.

На што разьлічвалі ўсе гэтыя правакацыйныя паведамленьні—дагадацца ня цяжка. Іх мэта зводзілася к таму, каб увесьці ў заблуджаньне сяброў Кітайскай рэволюцыі за мяжой і каб сеяньнем панікі паслабіць позіцыі Уханскай арміі ў яе пераможным наступленьні на Пекін. Сёньня мы друкуем цэлы шэраг паведамленьняў, якія малююць становішча Ухана зусім інакш. Праўда, за апошнія дні ўханскаму ўраду прышлося пераежыць цэлы шэраг цяжкасьцяй, зьвязаных галоўным чынам з здрадніцтвам некаторых сваіх вайсковых частак на чале з Сяо-Ду-Інам, якія перашлі ў бок Чан-Кай-Шы і якія пачалі наступленьне на Ханькоў. Становішча, якое стварылася было, вядома, даволі сур'ёзным, але не настолькі, каб аб гэтым трубілі ворагі Кітайскай рэволюцыі, якія жаданае прынялі за ўжо ажыцьцяўлёнае.

Сёньняшнія тэлеграмы сьведчаць аб тым, што ўханскаму ўраду ў значнай ступені ўжо ўдалося перамагчы ўзьнікшыя цяжкасьці. З бунтарскай групай Сяо-Ду-Іна ўдалося расправіцца амаль што поўнасьцю. Уханскія войскі атрымліваюць перамогу за перамогай як на хэнаньскім фронце, так і на іншых, разьбіваючы ворага.

Апошнія тэлеграмы з крыніцаў, якія заслужваюць поўнага давер'я (Тасс, Нацыянальнае Агенцтва Ханькоў) падцьвярджаюць у адзін голас, што «**гаспадаром становішча поўнасьцю зьяўляецца ўханскі ўрад», «няма ніякіх падстаў для панікі», што «сілы, якімі кіруе нацыянальны ўрад на подступах к Ухану, больш, чым дастатковы, каб справіцца з любой небясьпекай, якая можа ўзьнікнуць»**

Бліскучыя перамогі ўханскіх войск

Ваенны савет уханскага ўраду атрымаў наступную тэлеграму ад Тан-Шэн-Чы (камандуючага ўханскімі войскамі ў провінцыі Хэнань): **«14-га мая нашы войскі атакавалі ворага ў раёнах Чанцаю, Сіпіна і Хошуйчэна** (усе тры пункты знаходзяцца паміж Уханам і Чэнчжоў). **Пасьля трохдзённага бою мы ўзялі Чанцай, Сіпін і вучастак па плыні ракі Хун-Хэ.**

Страты ворага выражаюцца ў 8 тысяч забітых і 5 тысяч пленных. Мы захапілі 10 палявых гарматаў, 20 кулямётаў і вялікую колькасьць патронаў. 17-я армія мукдэнцаў зусім разьбіта. Нашы авангарды дасягнулі Чо-Дзягоў на рацэ Таша-Хэ».

Газэты паведамляюць, што ўся лінія абароны мукдэнцаў, якая знаходзілася на 20 міль па абодва бакі чыгуначнага шляху, настолькі разбурана, што пераможныя расьсейваюцца па ўсіх напрамках замест таго, каб адступаць уздоўж дарогі.

Ворагі кітайскай рэволюцыі, захапляючыся ад радасьці, папярэджвалі хуткую пагібель Ухана, які адзін твар да твару з унутранай контррэволюцыяй і міжнародным імпэрыялізмам упарта вядзе барацьбу за інтарэсы кітайскіх працоўных мас, але, як відаць, ворагі зноў пралічыліся, як яшчэ пралічуцца ня раз.

Уханскі ўрад з здарэньняў апошніх дзён павінен для сябе зрабіць якія-небудзь вынікі, а іменна: **аб яшчэ большым узмацненьні кіруючага складу арміі надзейнымі працаўнікамі, аб бязьлітаснай барацьбе з чан-кай-шысцкімі элемэнтамі ўнутры Гоміндану і арміі.**

Цяжкасьці на шляху кітайскай рэволюцыі сустрэнуцца яшчэ ня раз. Перамагчы ўсе гэтыя цяжкасьці Уханскі ўрад і левы Гоміндан змогуць толькі пры дружнай рабоце з кітайскай компартыяй і апіраючыся на рух шырокіх працоўных мас.

Рацыяналізуй самаго сябе!

Мы прывыклі: сходы пачынаць са спазьненьнем, даклады рабіць 2-х гадзінныя; не разьмяркоўваць свой час. Дзякуючы няўменьню рацыяналізаваць сябе, мы ня зможам быць добрымі працаўнікамі ў вытворчасьці, установе ці ў грамадзкай працы.—Рацыяналізаваць самаго сябе, сваю працу, усё сваё жыцьцё—баявая задача кожнага комсамольца.

За парадак, за культуру.

(У парадку абгаварэньня).

Многія таварышы выказваюць свае думкі на сходах ячэек, што нашы ячэйковыя сходы да таго абрыдзелі, што аж неахвота іх наведваць. Нам здаецца, што ня так бывае на самой справе, не такія ўжо няцікавыя сходы, каб яны маглі абрыдзець многім комсамольцам. Аказваецца, у нас тут ня ўсё абстаіць добра.

Каб не хадзіць далёка, мы возьмем прыклад нашых сходаў, пасяджэньняў, вечароў і інш. Ужо ўвайшло у прывычку пазьніцца на пасяджэньні, сходы або вечар на гадзіну і болей. **«Ня сьпяшайся, там яшчэ не зьбяруцца, хопіць часу»!**

Прывычка



Раз сход скліканы на сем гадзін, дык можна сьмела паспаць да дзевяці.

Тут справа ў тым, што многія няправільна ўявілі сабе напрамак нашага саюзу ў ажыўленьні працы. Вось дзе на нашай думцы захаваны усе непаразуменьні.

Наша партыя праводзіць напружаную працу па рацыяналізацыі прамысловасьці. Нам трэба скарыстаць усе дасягненьні навукі і тэхнікі па абсталяваньню фабрык, заводаў, скараціць лішнія выдаткі, зьнішчыць прагулы, падняць такім парадкам вытворчасьць працы, удзешавіць тавары, а разам палепшыць экономічны стан рабочых. Над гэтай работай думаюць і нашы комсамольскія ячэйкі.

Раз мы праводзім рацыяналізацыю, дык мы павінны разумець, што такую цяжкую справу мы зможам правесьці толькі пры ўмове сьвядомых адносін усіх рабочых і рабочай моладзі да гэтай працы. **Значыцца, уся наша работа павінна быць падпарадкавана гэтай задачы.**

Паглядзім, як нашы комсамольскія ячэйкі ў штодзённай сваёй рабоце рыхтуюць такіх людзей, як праводзіць работу па разьмеркаваньню часу сваёй працы.

Такое зьявішча мы назіраем на адным з групавых сходаў Ляхаўскай організацыі, тое-ж самае мы маглі бачыць на сходах ячэйкі Працаўнікоў Асьветы гор. Менску, тое-ж можна знайсьці у большасьці нашых комсамольскіх ячэек.

І вось, калі-б можна было падлічыць, колькі мы трацім дарэмна часу нерацыянальна яго скарыстоўваючы, то у выніку такога падліку можна атрымаць вельмі няпрыемны малюнак. А раз так, то з нашай комсамольскай масы могуць выхоўвацца людзі, якія ня змогуць разьмяркоўваць час сваёй работы, і, будучы на гаспадарчай або грамадзкай працы, будуць дрэннымі працаўнікамі.

Ня будзем гаварыць аб тым, што яшчэ і цяпер ёсьць многа такіх комсамольцаў, нават актывістых, якія ў сваім жыцьці нічым не адрозьніваюцца ад комсамольцаў 1920-21 году, калі экономічныя ўмовы былі куды горш. Мы можам бачыць яшчэ і такіх таварышоў, якія свае грошы трацяць бяз толку, сям'я жыве ў дрэнных умовах.

У зьвязку з такім зьявішчам, у зьвязку з тым, што мы пачалі весьці работу па прасоўваньню культуры ў масы моладзі, **трэба аб'явіць вайну, бязьлітасную вайну сваім беспарадкам, сваёй някультурнасьці ў рабоце.**

Усё гэта, аб чым мы гаворым, зьяўляецца аднэй часткай пытаньня. Аб зьмесце нашай работы мы ўжо праводзілі і праводзім напружаную працу па яго паляпшэньню. Таму мы аб ім у артыкуле гаворым мала.

Практычна прапануем: 1) Сходы ячэек павінны быць кароткімі, 2) даклады на сходах—кароткімі, чоткімі (ня больш чым 40-45 хвілін), 3) пачынаць сходы, вечары, розныя пасяджэньні роўна ў вызначаны час, 4) запатрабаваць ад кожнага комсамольца сьвядомых адносін да ячэйковай работы і работы ў сваёй вытворчасьці, у установе, 5) навучыцца разьмяркоўваць час сваёй работы так, каб кожная хвіліна дарэмна не прападала, 6) выкарыстаць усе магчымасьці на падняцьцё культурнасьці і політычнай сьвядомасьці комсамольцаў і усёй моладзі.

М. Краж.

АД РЭДАКЦЫІ. Зьмяшчаючы артыкул М. Кража ў парадку абгаварэньня, рэдакцыя лічыць, што закранутыя пытаньні ў працы саюзу маюць вялікую паважнасьць. Просьба да ячэек і асобных таварышоў выказацца.

Растратчыкі свайго часу.

(Кастрычнікавы і Ляхаўскі раён).

Маладыя чыгуначнікі-комсамольцы увесь свой вольны час праводзяць на масту, каля станцыі. Мост яшчэ ў мінулым атрымаў назву «Маста Пытак». Такую назву далі яму жыхары мясцовага раёну.

Кожны вечар па масту цягнуцца вераніцы комсамольцаў. Ходзяць яны ўзад і уперад да першай гадзіны ночы, покуль апошні цягнік не адыдзе.

На заўтра з неахвотай устаюць і позьняцца на працу.

Раённыя Камітэты Комсамолу павінны сачыць за гэтым і павесьці сярод комсамольцаў належную працу. Трэба вышукаць гэтых «злосных растратчыкаў часу» і аддаць іх комсамольскаму суду. Вакол пытаньня аб скарыстоўваньні часу трэба стварыць грамадзкую думку.

Чыгуначнік.

Зьніжэньне цэн і комсамол.

(Артыкул Намесьніка Наркому РСІ тав. Віленстовіча для „Чырвонай Зьмены“).

Зьніжэньне цэн палепшыць матар'яльнае становішча рабочай моладзі.

Партыя рашуча паставіла пытаньне аб зьніжэньні цэн і заклікала ўсіх рабочых і працоўнае сялянства дабівацца зьніжэньня цэн самым рашучым чынам, адкідваючы ўсё што перашкаджае гэтай рабоце, **бічаваць організацыі і працаўнікоў, якія не сьпяшаюцца, ня прымаюць усіх мер, каб зьніжэньне цэн да ўстаноўленага разьмеру і тэрміну было выканана, сурова караць вінаватых у гэтай справе.**

Зьніжэньне цэн паляпшае політычнае становішча рабочае клясы, што асабліва важна павінна быць для комсамолу.

Паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочае клясы, у тым ліку і рабочай моладзі—ёсьць адна з асноўных задач партыі і Савецкай улады. Вось чаму гэтак важна паднятая па ініцыятыве партыі кампанія па зьніжэньню розьнічных цэн, што зьяўляецца адным з галоўных спосабаў навышэньня заработнай платы.

Што павінен рабіць комсамолец

Комсамол у рабоце па зьніжэньню цэн не займае яшчэ ў поўнай меры таго месца, якое ён павінен займаць як масавая організацыя працоўнай моладзі, як апора партыі ў правядзеньні яе мерапрыемстваў, як грамадзкая сіла.

Тут у нас маецца прабел, недахоп, які заключаецца ў тым, што організацыі, якія па даручэньню партыі кіруюць і вядуць работу па зьніжэньню цэн, да гэтага часу ня далі комсамолу пэўнага, выразнага пляну, ня далі належнага заданьня.

Камсамол у працы па зьніжэньню цэн павінен прыняць больш рашучы ўдзел. Мабілізаваць усе комсамольскія організацыі, кожнага комсамольца.

Комсамол павінен паставіць лёзунг, што **непавінна застацца ніводнага комсамольца бяз самага актыўнага ўдзелу ў кампаніі па зьніжэньню цэн, кожны комсамолец павінен паказаць сваё ўменьне на справе, на практыцы праводзіць і ўмець прымушаць другіх праводзіць мерапрыемствы партыі і ўсяе рабочай клясы.**

Комсамол павінен рашуча павесьці мабілізацыю **комсамольскай і ўсёй савецкай грамадзкасьці** навакол крамных камісій, коопэрацыйных камісій пры фабрыках і заводах, навакол гандлюючых організацый, больш рашуча і хутчэй канчаткова зьнішчыць інэртнасьць гандлюючых організацый у кампаніі па зьніжэньню цэн, быць першым па ўнядрэньню ідэй зьніжэньня цэн у самыя нізы, у самыя глухія куточкі.

Рэха работы комсамольцаў, у першых шэрагах па зьніжэньню цэн, павінна стаць гучнай і чулай для ўсёй працоўнай моладзі, як чуцен рост ім ленінскай комсамольскай організацыі.

Зьніжэньне і ўпрашчэньне апарату.

Трэба сказаць, што зьніжэньне цэн не заўсёды ўвязваецца з рацыяналізацыяй і патаненьнем апарату і гэта выклікае небясьпеку, што **зьніжэньне цэн будзе праводзіцца за кошт праяданьня асноўных капіталаў і такім чынам не стварае адпаведнай устойлівай падваліны пад правядзеньне зьніжэньня цэн.** Вось на гэту акалічнасьць трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Зьніжэньне розьнічных цэн ня можа быць ня зьвязана з вытворчасьцю, з якасьцю прадукцыі і працоўнай дысцыпліны, што таксама трэба мець на ўвазе.

Пытаньне зьніжэньня цэн пастаўлена надзвычайна сваечасова.

Першы тэрмін вызначаны партыяй—першае чэрвеня, ужо зусім блізка, а 10 процантаў зьніжэньня цэн, па маючымся падлікам, яшчэ шмат няпоўныя.

Але трэба мець на ўвазе, што на гэтым першым пробным тэрміне і процанту, спыняцца ня прыдзецца, **гэта толькі пачатак,—работу па зьніжэньню цэн прыдзецца весьці і ў далейшым.**

Я ўпэўнен, што настаўленыя нормы зьніжэньня ў вызначаны тэрмін у поўнай меры выконваемы.

Трэба толькі з боку шэрагу організацый і паасобных работнікаў правяць гэтаму пытаньню больш увагі. Найбольшую ўвагу трэба зьвярнуць на пізавы гандлёвы апарат і мясцовую прамысловасьць і вызначанае зьніжэньне цэн будзе выканана. **Тым хутчэй і тым лягчэй яно будзе выканана, чым больш будзе актыўны і больш рашучы ўдзел у гэтай рабоце комсамольскіх організацый і кожнага комсамольца.**

Парушаюцца гранічныя накідкі.

Хто вінаваты?

Самы дрэнны спосаб праверкі зьніжэньня цэн,—гэта распытваньне кіраўнікоў гандлёвых організацый. Яны вам скажуць, што ў іх установе, будзь гэта «Беларускі Ларок», «Чырвоны Крыж», Цэрабкоп і г. д., усё добра, зьніжэньне ідзе за зьніжэньнем, спажывец здаволен як нідзе і г. д.

Калі-ж даводзіш такому «рацівяму» дзядзьку, хаця-б з Цэрабкопу, што ён дарэмна хваліцца, што ў магазыне транспартнай коопэрацыі (ТПО) цукер, мука і г. д. каштуюць таней, ён ня ўпушчае выпадку вылаяцца па адрасу ТПО.

— Таней? Што значыць на капейку, ці на дзьве танней. За тое ў нас тавар лепшы, у той час як у іх цукер ня цукер, мука ня мука, а выбачайце за выражэньне...

— Вы пытаецеся ці здолеем мы да першага чэрвеня зьнізіць цэны на 10 процантаў? Аб гэтым будзьце спакойны. Пра нас сам Наркамгандаль ведае, што мы ня спыняемся перад стратамі, калі трэба зьнізіць...

Вось што тлумачыць вам прадстаўнік амаль кожнай коопэратыўнай організацыі, з якім прыходзіцца мець гутарку аб зьніжэньні цэн. «Проста самі сабе ў страту гандлюець ідучы насустрэч спажыўцу»,—вось які вывад напрашваецца сам сабой.

Але ў кожнага можа ўзьнікнуць запытаньне—ці сапраўды справа зьніжэньня цэн знаходзіцца ў такім «казённым благапалуччы», як гэта расьпісваюць коопэратары.

Задаўшыся гэтым запытаньнем, супрацоўнік «Чырвонай Зьмены» ўчора наведаў шэраг крам розных гандлёвых організацый, раскінутых як у цэнтры гораду, гэтак і на акраінах. Гэтыя наведваньні даводзяць зусім адваротнае таму, што тлумачаць «усердныя» коопэратары.

* * *

Перад намі лічбы і лічбы... Прэйскурантныя цэны на адны і тыя-ж тавары ў магазынах,—ТПО, Менцэрабкопу, Чырвонага Крыжу, Беларускага Ларку і коопэратыву «Агульная Праца».

Нават беглы агляд гэтых лічб кажа, што найбольшых посьпехаў у справе зьніжэньня цэн дасягнула транспартная коопэрацыя Заходняй Чыгункі. Сьледам за ёй ідуць ТПО, МББ ч. Менцэрабкоп і Беларускі Ларок значна адстаюць. Чырвоны-ж Крыж і коопэратыў «Агульная Праца» зусім плятуцца ў хвасьце. Цэны ў двух апошніх крамах амаль супадаюць з прыватнымі.

Вось некалькі лічб на больш масавыя тавары.

Цукер-рафінад кілё каштуе: 67 кап.—у ТПО З. Ч.; 67½ кап. у ТПО МББч., 69—у МЦРК; і нарэшце 70 кап. у коопэратыве «Агульная Праца» і Беларускім Ларку.

Кілё цукравога пяску: 58 кап. у ТПО Зах. і МББч.; 60—у МЦРК; 70 к. у Чырвоным Крыжу.

Кілё солі каштуе: 2½ кап. у ТПО, і 3½ ва ўсіх астатніх коопэратывах.

Рыс каштуе: у транспортнай коопэрацыі—36 кап. кілё, у МЦРК—38½ кап., у Беларускім Ларку—54; Чырвоным Крыжу—56 і коопэратыве «Агульная Праца»—57 кап.

Кілё грэцкай крупы каштуе: 15 кап. у ТПО; 18½—МЦРК; 19½—«Агульная Праца» і 20 кап.—Ларок.

Вышэйпрыведзеных лічб, па нашай думцы, дастаткова, каб давесьці вялізарную розьніцу, якая існуе на аднолькавыя тавары ў розных коопэратыўных організацыях.

Чым выклікана гэтая розьніца?—Зразумелая рэч—раздутымі штатамі, «правільным ажыцьцяўленьнем рэжыму экономіі» і г. д.

Але мы хочам зьвярнуць увагу Наркамгандлю на адзін факт. **Розныя цэны на аднолькавыя тавары сьведчаць аб самавольным парушэньні гранічных накідак устаноўленых Наркамгандлем і Рэспубліканскай Камісіяй па зьніжэньню цэн.** Хмара.



Замежны комсамол у барацьбе.

Пленум ЦК КСМ Англіі.

9-10 красавіка ў Лёндане адбыўся пленум ЦК КСМА. Пленум абгаварыў галоўнейшыя проблемы, якія зараз стаяць перад саюзам. Абгаварвалася пытаньне аб новым наступленьні капіталу супроць рабочае клясы, што выражаецца ў вядомым законе супроць профсаюзаў, і вызначана політыка КСМ у адносінах да гэтага наступленьня. Пленум абгаварыў таксама здарэньні ў Кітаі і ўхваліў узмацніць працу саюзу ў гэтай галіне. Апрача таго, пленум абгаварыў пытаньні адзінага фронту, оргпрацы, працы сярод дзяцей і г. д.

КСМ Злучаных Штатаў супроць лягернай дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Вярбоўка ў гэтыя лягеры, якая нядаўна пачалася, ўжо дала добрыя вынікі. Паведамленьні вярбовачных пунктаў у розных частках краіны аднагалосна кажуць аб тым, што норма, якая намячалася, выканана ўжо амаль поўнасьцю. Буржуазіі зноў удалося уцягнуць рабочую моладзь у гэтыя лягеры, якія організуюцца пад выглядам добрага праводжаньня часу, спорту і г. д.

КСМ пачаў кампанію супроць гэтых лягераў пад лёзунгам «Байкот лягеру». Саюз дабіўся ўжо некаторых посьпехаў у справе прыняцьця рэзолюцый протэсту супроць лягераў у фэдэрацыі працы Пэнсільваніі і Віскансыны. У іншых мясцовых організацыях профсаюзаў таксама вялася агітацыя за тое, каб зрабіць націск на цэнтральнае праўленьне профсаюзаў (якое офіцыйна падтрымоўвае лягеры) у бок зьмяненьня яго політыкі ў гэтым пытаньні.

Саюз праводзіць усю працу у пытаньні лягераў у зьвязку з барацьбой супроць політыкі ўраду ў Нікарагуа і Кітаі. Саюз разгортвае таксама актыўную дзейнасьць сярод саміх удзельнікаў лягеру шляхам організацыі мітынгаў протэсту, распаўсюджваньне лістовак і г. д.

Супроць фашызму

5-га мая ў сувязі з днём Стальнога Шлёму адбылося пяць вялічэзных дэмонстрацый-протэсту бэрлінскай рабочай моладзі, на якіх прысутнічала звыш 10.000 маладых рабочых. Дэмонстрацыі мелі яскрава выяўлены баявы характар і былі адным з довадаў, што, ня гледзячы на ўсе пагрозы фашыстаў, Бэрлін застанецца чырвоным.

Да міжнароднага дзіцячага тыдню

«Піонэрскія партбілеты» за мяжою.



Зьлева—нямецкі, пасярэдку—аўстрыйскі, справа—ангельскі «Юных таварышоў».

СЯЎБА Ў РАЗГАРЫ.

Досыць карміць нас гутаркамі!

На сходзе **Бачэйкаўскай комсамольскай ячэйкі** (Самахвалавіцкі раён) было настаўлена пытаньне аб пасеўнай кампаніі. Агроном праводзіў гутарку. Гаварыў досыць шмат і ўсё «наогул», практычныя парады і настаўленьні маладым гаспадаром у яго гутарцы амаль адсутнічалі.

Комсамольцаў і беспартыйную моладзь, што прысутнічала на сходзе цікавіла не **«наогул»**, а **«у прыватнасьці»**, цікавілі конкрэтныя практычныя парады, выходзячы з умоў данай мясьцовасьці.

Вось таму, як агроном скончыў гутарку, яму градам пасыпаліся вясковыя запытаньні.

— Як лепш вывесьці грыбы на пладовых дрэвах?

— Калі лепш сеяць лён і якім гноем угнойваць глебу пад яго? і шмат іншых.

Я запытаўся, дзе можна купіць насеньня канюшыны. Мне агроном адказаў, што ў іх, на аграпункце. Падаў я ў аграпункт заяву і чакаю. Чакаў-чакаў, ды годзе сказаў. Пашоў прапытваць сам, ажно аказалася, што на аграпункце ніякага насеньня і няма.

І так заўсёды: калі трэба аграному праводзіць гутарку, дык весткі для яе ён бярэ з паветры.

Мне здаецца, што нечага гутарыць у пустую, забіваць галовы, бо пустых гутарак ня любяць нашы і сяляне. Трэба, каб нашы аграномы ведалі, што робіцца ў сельскай гаспадарцы раёну і давалі сялянам толькі практычныя парады.

Гайсёнак

Сажы больш ня будзе.

(Вёска Скураты, Слабодзкі сельсавет. Меншчыка).

У мінулым годзе ўплялася к нам у ячмень і пшаніцу чорная сажа, якая вельмі пашкодзіла усяму насеньню і ўраджаю.

— Пакараў, —кажуць сяляне,— бог нас за грахі, награшылі многа. Як прышла чарговая вясна, пашоў я да раённага агранома, узяў фармаліну і стаў гаварыць бацьку, каб прамыць насеньне. Незгаджаецца, і слухаць нават няхоча.

Нічога ня зробіш, стаў прасіць у бацькі, каб ён даў мне фунтаў 10 пшаніцы і ячменю. Праўда, згадзіўся ён на гэта і я пасеяў прамытае насеньне асобна ў другім куску.

Мой ячмень і пшаніца парасьлі вельмі добрыя і чыстыя, а па агульным полі зноў такі было шмат сажы. Дзівіцца бацька і суседзі на гэта боскае зельле, так зваў бацька фармалін.

У гэтым годзе яшчэ сьнег ня спаў, а мой бацька ўжо раздабыў фармалін. Пасеялі пшаніцу і ячмень толькі прамытым насеньнем.

Комсамолец **Кулінковіч Пятрусь.**

Радасьць, бы майскі дзень...

Васіль – прыкладны комсамолец, прыкладны чалавек на сваім пасёлку...

Ніхто на Васіля ня крыўдзіцца, ніхто на яго нічога кепскага ня скажа. І гэтага рабіць—ніхто ня мае права.

Часта сам з сабою Васіль разважаў:

— Жыцьцё... Людзі. А людзі! Колькі іх ёсьць кепскіх і нядобрых. Колькі не сьвядомых. Так і на пасёлку. Ёсьць хлопцы, проста гультаі, толькі піць не ляпуюцца... Як-бы добра было жыць на зямлі, як бы прыгожа зямля выглядала, каб усе людзі былі як... Ленін .. так, як Ленін... з такою моцнаю воляю.., розумам.

Больш за ўсё хвалявала Васіля тое, што пасялчане, суседзі, якія жывуць дзесяткі год разам, якія тут радзіліся і якім тут прыдзецца дажываць веку—ніяк не сябравалі паміж сабою.

Кожны гаспадар жыў толькі сваім жыцьцём, думаў толькі аб сваіх справах і другому быў ворагам.

Пасёлку адпусьцілі кавалак высечанага лесу. Кожны пасялчанін атрымаў прырэзку. Трэба было гэту прырэзку апрацаваць, прывесьці ў выгляд, прыгодны для засеву.

І кожны селянін выяжджае на сваім каняку, запрагае ў плуг, надрываецца і сам, надрывае каня вывaрачваючы карчэўе.

А чаму-б двум ці тром гаспадарам ня спрэгчыся, чаму-б не араць глыбей, запрогшы пару коняй?

* * *

— Дзядзька Максім! Ну як ворыва ідзе?

— Мука, сынок, а ня ворыва,—выняўшы з роту люльку адказаў Максім Васілю.

— А што, дзядзька, каб мы запрэглі сваіх сівакоў у адзін плуг ды ў міг турнулі прырэзкі!

— А што думаеш...


Дагаварыліся...

Назаўтра Васіль і Максім выехалі на поле, Максім узяў коняй і павёў па простай лініі, а Васіль моцнымі рукамі ўпарта трымаў плуг, які пераварачваў зьлежаную зямлю, пад нарогам якога трашчалі карэньні...

Суседзі з задавальненьнем глядзелі на колектыўнае ворыва, злавалі на сябе, што не зрабілі такога пачыну.

А Васіль быў рад, што гэтай маленькай колектыўнай працай вучыць другіх пасялчан. Яго радасьць, бы майскі дзень разьлівалася у грудзёх...

Ярына.



Прымаць непасрэдны ўдзел у рацыяналізацыі вытворчасьці—задача комсамольца-рабочага.

Піонэры працы.

(З вопыту Рэчыцкай арганізацыі.

Ня ўсе вытворчыя ячэйкі ў акрузе шчыльна падышлі да жыцьця свайго прадпрыемства. Аднак некаторыя ячэйкі не праходзяць міма фактаў вытворчай недысцыплінаванасьці і надбайных адносін да працы і практычным паказам дабліжаюцца да актыўнага ўдзелу ў вытворчым жыцьці.

Так, напрыклад, на гвазьдзільна-вінтавым заводзе «Інтэрнацыянал» комсамолец Іцкоў Рыгор—гвазьдзільшчык унёс у вытворчай нарадзе прапанову аб замене нафты салам пры смазцы дроту ў гвазьдзільным цэху. Ён давёў, што гэта дасьць меншую амартызацыю і палепшаньне якасьці продукцыі. Вытворчая нарада прыняла прапанову і яна праведзена ў жыцьцё.

Па прапанове комсамольца Гарэліка Моні («Інтэрнацыянал») уведзена навізна у абточцы шнекал на фрэзерным станку —дзякуючы чаму замест ранейшых 12 гадзін, на вытачку адной шнекалы ідзе 2 гадзіны.

Шэраг практычных прапаноў, вылічаных і праверaных, унёс т. Міхаленка па частцы рацыяналізацыі і палепшаньня вырабу фанеры на ф-цы «Днепр».

Рыгор Фаменка—сьлесар комсамолец і вольны ад работы час адрамантаваў і пусьціў у ход зусім закінуты ўжо станок—прэс.

Але не ўсюды так.

— **«Ты яшчэ малады, нічога не разумееш»**—заявіў адміністратар з майстэрняў камунтрэсту на прапанову комсамольца электрыка па частцы рацыяналізацыі на электрастанцыі. Гэта ўзор бюракратычных адносін да прапаноў з боку моладзі. І такі прыклад неадзіночны. Досыць успомніць ганеньне на комсамолку Купяўскую на ф-цы «Днепр» у мінулым годзе, за выступленьне на вытворчай нарадзе аб недахопах у цэху. Ці тое, што таварышу Іцкову да ўкому партыі прышлося давесьці справу пакуль адміністрацыя заводу згадзілася правесьці ў жыцьцё яго прапанову прынятую вытворчай нарадай. Вядома, гэткія адносіны дрэнна адбіваюцца на актыўнасьці комсамольцаў і нам прыдзецца такія моманты браць пад абстрэл.

К. В-к.

Пільна сачылі за рухам рук

(Нова-Барысаў)

Нядаўна, на адчыненьні 5-ай агульна-гарадзкой рабочай конфэрэнцыі моладзі Барысаву і Нова-Барысаву, адбыўся вытворчы конкурс.

У конкурсе прымалі ўдзел работніцы «Чырвоная Бярэзіна»—пяць упакоўшчыц і дзьве купіршчыцы.

Пры паўнюсенькай залі людзей, на сцэне зьявіліся сталы з рамамі запалак і скрынкамі. Пяць работніц у адну хвіліну узяліся за сваю справу.

Работа ішла шпарка. Не пасьпееш вокам прасачыць, як ужо з рук вылятае поўная скрынка запалак. У залі была цішыня. Вочы пільна сачылі за рухам рук. Толькі шорах запалак у руках работніц парушаў гэтую цішыню.

Вось скончылі працу дзяўчаты ўпакоўшчыцы, заслона зачынілася, і публіка чакала вынікаў конкурсу. Раптам падымаецца заслона і голас журы стаў перадаваць якасьць упакоўкі.

— У вас т. Элькінд шмат бразгуноў —(ня поўных скрынак).

— А у вас, т. Рухман, шмат лішніх запалак.

Вясёлыя твары дзяўчат ухмыляліся і казалі, «паправімся надалей».

Другі конкурс быў паперніц-укупіршчыц. Зноў заля сачыла за машынальным рухам рух, зноў шушукалі сінія лісты паперы і журы мяккім голасам чапаў чырвонашчокіх дзяўчат.

— У вас т. Бейненсон няправільны рубец —(загібаньне паперы) і гэтак усім па недахопам —заслуга.

Усё-ж конкурс вытрымала трое. Першая т. Элькінд, зрабіўшая раму за 2 хвіліны, другая т. Рухман зрабіўшы раму за 2,55 хвіліны, і трэцяя ўкупіршчыца, закупіраваўшы 13 дзесяткаў за 2 хвіліны. Усім вытрымаўшым конкурс былі раздадзены падарункі.

Трэба адзначыць, што гэты конкурс вельмі зацікавіў моладзь. Наш коллектыў комсамолу «Чырвоная Бярэзіна» мае цяпер на мэце ў самым хуткім часе правесьці на фабрыцы такі-ж конкурс, і данасаваць яго так, каб у ім прынялі ўдзел больш шырокія масы моладзі.

С. Клопаў.

Мы падначалілі жалеза

(На курсах Цэнтральнага Інстытуту Працы)

З 20-га красавіка г. г. Менская Біржа Працы комплектавала некваліфікаваную моладзь у Цэнтральны Інстытут Працы.

Да 10-га мая прыём курсантаў быў скончаны, і адміністрацыя падзяліла курсантаў на наступныя два цэхі: кавальскі і сьлясарны.

У нас у ЦІП'е устаноўлена належная дысцыпліна. Курсант, спазьніўшыся 3 разы на працу, і зрабіўшы 2 прагулы бярэцца на асобы вучот і пры паўтарэньні ў далейшым спазьненьняў і прагулаў, курсанта выключаюць з курсаў.

Пачынаецца рабочы дзень. Курсант падыходзіць да сваёй шафы, бярэ нумар і апрануўшыся ў рабочы халат чакае заняткаў. Тым часам дзяжурны зачыняе шафы і адмячае ў асобую кніжку незабраныя нумары. Такім чынам вядзецца вучот спазьненьняў і прагулаў.

Падаецца каманда—стройся. Курсанты строяцца і становяцца на свае месца. Размовы спыняюцца і толькі каманда інструктара парушае гэтую цішыню. Пасьля 10-ці хвілін занятку фізкультураю накіроўваемся ў цэх. Тут прыкоўваецца ўвага да вытворчасьці. Шарахцяць напільнікі, стукаюць молаты—усё гэта зьліваецца ў унісон агульнай працы.

За гэты часы мы ўжо шмат чаму навучыліся. Раней мы працавалі з драўлянымі напільнікамі. Усе курсанты сьмяяліся, гаворачы, што будзем дзеравянымі майстрамі і быў адказ інструктара, «што ў гэтых драўляных напільніках хаваецца вялікая справа». Папершае, мы экономім у матар'яле, а падругое, у інструмантах.

Цяпер мы ўжо працуем сапраўднымі інструмантамі. Мы адчуваем сябе гэроямі ў сваёй вытворчасьці. Жалеза ў нашых руках прымае форму, па нашаму жаданьню.

Акрамя практычнага навучаньня, мы займаемся яшчэ тэорыяй. Тры разы на тыдзень у нас праводзяцца лекцыі і практычныя вырашэньні геомэтрычных фігур. Такім чынам мы зможам з тэарэтычнымі ведамі падыйсьці да мэталю і да варштату.

Шлёнскі.

На вуліцах гораду Леніна.

(Уражаньні).

Пад'яжджаючы к ваколіцам Ленінграду, па ініцыятыве хлопцаў-штабістаў зроблена была самі з сабою «смычка»... Выбралі адно купэ, дзе зьмяшчаліся «далучэнцы» да Беларусі й грымнулі маладымі, комсамольскімі песьнямі... Зьвінелі песьні і незмаўклі... А людзі на палатне жалезнай дарогі працуючыя, астанаўліваліся, слухалі, часамі зьдзіўлена паглядалі, часамі усьміхаліся...

Гэта былі рабочыя, яны рапаравалі шпалы... Ім чорным, замызганым, запрацаваным махалі рукамі экскурсанты з вокнаў вагонаў, і ў адказ рабочыя весела ківалі галовамі, шапкамі...

І ўвесь час не пераставала музыка: шумавы аркэстр з песьнямі...

А потым раптам нехта з вакна, перасунуўшыся на двор і крыкнуў у вагон:

— Таварышы... Ленінград!..

І рынуліся ўсе к вокнам. Пачалі перакідацца ўсім тым, што змаглі убачыць з налёту:

— Глядзі, глядзі, вунь-вунь дымяць трубы...

— Вунь, здаецца... вышка Ісакіева відаць...

— Ужо Ленінград!..

А між іншым яшчэ далёка было да гораду. Пачалі зьбірацца, апранацца, укладываць у чамаданчыкі, клумкі свае рэчы...

У левым баку ад цягніка прыгожымі купамі дрэў і красунямі-купаламі мігнуліся дварцы... І мусіць кожнаму падумалася віхрам завярцелася і зарыла адна думка:

— Гэта-ж дварцы «Царскасельскія» дзе цары барствалі ў бязглуздай гулянцы забывалі аб усеагульным катаваньні працоўных, аб карчме...

І тут-жа думкі з уяўленьнем перакідаюцца ў другі бок, дзе вочы ў шэрай, туманнай далі шукаюць камяніцы, вуха ловіць стальны, жорсткі крык гораду...

Усе гатаваліся сустрэць па-сьвяточнаму горад, радасна, так слаўна...

Як натое зірнула ласкава сонечка, скрозь туманныя сьлёзы усьміхнулася, і гэтакая-ж ласкавая усьмешка прабегла па тварах экскурсантаў, як толькі цягнік прыастанаўлівая ход падышоў да станцыі...

Вось і бурлівы Ленінград.

* * *

З вагону на пэрон вышлі.

А тут разам з крыкам працоўным, з лязгам жалезным, з гудкамі паравозаў, з звонам аднекуль з гораду—зьбіліся зыкі й гукі экскурсантаў разам з басам матросаў.

Белыя вярхі бесказырак з чорнымі йстужкамі ззаду, чорная вопратка, загарэлыя, да чарноты абветраныя твары—яны ветліва-ласкава ўсьміхнуліся выходзячым з вагону экскурсантам...

А як вышлі—абступілі матросы пярсьцёнкам з усіх бакоў з надпісам на абячэйках шапак «Парыская Комуна», шукалі сярод хлопцаў знаёмых, а як сустракалі—буйна радаваліся, сьмяяліся...

А потым сустрэча—мітынг.

Тав. Курцік, старшыня экскурсыйнай камісіі, ад імя ЦК комсамолу Беларусі гаворыць аб мэтах нашага прыезду і вітае падшэфны нам флёт і Ленінградзкі комсамол...

Гаворыць ад імя Ленінградзкага Губкому комсамолу т. Адамовіч, Собалеў, ад флоту т. Настусевіч, і ўсё аб адным... з вітаньнем...

Кожную прамову аратараў пакрывае аднагалоснае, комсамольскае:

— Ура!..

Ад імя экскурсантаў адказнае слова мае т. Каваль!.. Скромнымі, ціхімі сказамі, але глыбока ад душы гаворыць аб тых жаданьнях і падзеях з якімі пасылала ўся моладзь Беларусі сваіх таварышоў-экскурсантаў...

...А вочы ўсіх прыехаўшых прытка бегалі па вярхушках мураваных квадратаў, упіраліся ў залатыя шпілі, што вярхушкамі скробалі неба...

Сьмяялася неба, блішчэў ранішнім мокрым налётам горад...

* * *

Першы раз ступілі сваёю нагою на брук Ленінграду. Весела, разам з матросамі ішлі па вуліцы, пелі беларускую марсельезу, кончыўшы яе ўзноў пачыналі, пераходзілі на другія беларускія...

На вуснах сьмех гуляў, вочы мералі камяніцы-волаты, вушы слухалі жорсткія, прарэзьлівыя аж да надаеданьня, званкі трамвайныя, аўтамабільныя сірэны, заводзкі гудок...

Ува ўсім гэтым чуўся шырокі, бязьмежны і вялікі размах, размах вялічыні падобны думкам Леніна...

А як ідзеш далей «па Неўскаму» міжвольна думаецца і адчуваецца і нясецца ў выбражэньні:

— Я іду па тых сьцежках сягоньня, дзе хадзілі ў 17 год вялікія барацьбіты Рэволюцыі...

* * *

Пашлі чарадою па бруку...

Намiраваліся к агляду гораду, а для таго—каб лепш увіць горад трэба было ўлезьці на вышку Ісакіеўскага сабору. Надыходзім к сабору і ён выглядае зусім не такім, як думаў яго ўбачыць... Здаецца нізкі, няказісты...

Набраліся на верх па крутых і цесных драбінах. Як толькі ўзабраліся на вышкі й зірнулі уніз--душа, як то кажуць, у пяткі залезла...

Горад-шахматнай дошкай адбіўся... Людзі-мурашкамі соваліся, аўтабусы і карэты-дзіцячымі цацкамі... Увесь Ленінград, як на далоні. Перада мною «Сенатская площадь», і садок раскінуўся і здаецца ён разьбітым кавалачкам луга ды разьведзены пальцамі жартаўніка; памятнік Пятру I і то здаецца цацкай... Прыгожай цёмна-сіняй істужкай закованая ў цяжкія каменьні бяжыць бурная Нява.. Празрыстае паветра, і далёка відаць навокала: пагода ціхая, соўнечная, аднак на вышках-бура...

І як глядзіш—перад табою горад каменю, вады і паветра здаецца напоўненага вадою і скутага каменьням. Хочацца бачыць прывычным беларускім вокам травіцу зеленіва, дрэвы. .

Злазіш і ўздыхаеш трохі вальней і ўжо хочацца прайці па бруку, зьведаць сапраўдныя вялікія дасягненьні Кастрычніка узгадаваныя думкамі Леніна...

І мы пашлі...

М. Нікановіч.



ВЯРНУЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ ЭКСКУРСІЯ МОЛАДЗІ.

ЭКСКУРСІЯ ПРАШЛА З НАДЗВЫЧАЙНЫМ ПОСЬПЕХАМ.

25-га ў Менск вярнуліся ўдзельнікі ўсебеларускай экскурсіі моладзі. Па іх апавяданьням, экскурсія прашла з надзвычайным посьпехам—усе задаволены.

У часе прабываньня экскурсіі ў Ленінградзе, апаратарам Ленінградзкага Аддзяленьня Белдзяржкіно было зроблена шэраг здымкаў экскурсіі. У хуткім часе гэтыя здымкі будуць дэмонстрыравацца ва ўсіх кіно-тэатрах Беларусі.

Падрабязна аб экскурсіі чытай у наступным нумары «Чырвонай Зьмены»!

Саюзныя навіны

(У ЦК УсеЛКСМ)

Цэнтральныя курсы актыву

ЦК УсеЛКСМ прызнаў неабходным арганізацыю цэнтральных тэарэтычных курсаў комсамольскага актыву працягам ад 9 месяцаў да 1 году. Склад курсаў вызначаны у колькасьці 40—50 чалавек працаўнікоў цэнтральнага і губэрнскага (рэспубліканскага і акруговага) актыву.

Разам з тым, ЦК УсеЛКСМ паказаў мясцовым арганізацыям на неабходнасьць ўсямернага выкарыстаньня розных губэрнскіх і абласных курсаў партпрацаўнікоў для тэарэтычнай вучобы актыву.

Пленум ЦК

На 1-е чэрвеня назначаны чарговы пленум ЦК УсеЛКСМ 7-га склікаьня. На парадку дню пленума: пытаньні рацыяналізацыі вытворчасьці і экономпраца саюзу, пытаньне аб активе, аб зьменах у складзе бюро і сэкратарыяту ЦК і інш.

Колькі зараз комсамольцаў

Па апошніх вестках ЦК УсеЛКСМ, у сучасны момант на ўсёй тэрыторыі СССР налічваецца 67174 ячэйкі з агульнай колькасьцю сяброў УсеЛКСМ у 2.026.455 чал. і 120.295 кандыдатаў. Піонэратрадаў налічваецца—45662 з агульнай колькасьцю піонэраў 1.725.488.

Акцябрат налічваецца—277. 632,

Шэфства над кітайскім саюзам

Мясцовыя організацыі УсеЛКСМ па прыкладу Маскоўскай і Ленінградзкай організацый прымаюць шэфств над асобнымі організацыямі КСМ Кітая.

Комсамол Башкірскай Аўтаномнай Рэспублікі прыняў шэфства над Ван-Сянскай організацыяй КСМ Кітая

Падрыхтоўка да сьвята Кастрычніка.

Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ з сяброў бюро і сакратарыяту вылучыў комісію па правядзеньню 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэволюцыі. Камісія распрацоўвае пытаньне аб удзеле моладзі ў правядзеньні сьвята.

Набор у ваена-марскія вучылішчы.

Пачалася вярбоўка ў ваена-марскія вучылішчы рэспублікі.

ЦК УсеЛКСМ прапанаваў мясцовым організацыям УсеЛКСМ прыняць энэргічны ўдзел у правядзеньні вярбоўкі. Зацьверджана разьвёрстка.

Спэктаклі Малага Тэатру для рабочых

Каб даць магчымасьць шырокім масам рабочых і служачых пабываць на пастаноўках Маскоўскага Акадэмічнага Малага Тэатру, культаддзел ЦСПСБ закупіў 3 спэктаклі ў Доме Культуры спэцыяльна для членаў профсаюзаў.

Былі пастаўлены 2 разы „Любоў Яравая" і адзін раз „Аракчэеўшчына".

Галубок вандруе...

Гастролі Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру пад кіраўніцтвам Галубка прайшлі з нябывалым посьпехам па Калінінскай акрузе. Тэатр наведаў наступныя гарады: Горкі, Клімавічы, Мсьціслаў, Крычаў і Чэрыкаў.

Студэнт, які ён ёсьць

Што выявіла культурна-бытавая анкета.

Недаеданьне—звычайная рэч.—60 процантаў хворых.—Няма сродкаў на культурныя патрэбы.—Аднак, настрой у асноўным здаровы.—Больш ўвагі студэнту!

Дзевятая конфэрэнцыя профсэкцыі студэнцтва БДУ зьвярнула ўвагу на неабходнасьць вывучэньня быту студэнцтва. З гэтай мэтай была праведзена сярод студэнтаў унівэрсытэту **культурна-бытавая анкета**.

З прычыны таго, што некаторыя пытаньні закраналі самыя інтымныя бакі студэнцкага жыцьця, анкета мела ананімны характар (адказы даваліся выключна падкрэсьліваньнем адпаведных даных; жадаючыя рабілі пісьмовыя заўвагі).

Запаўненьне анкеты было добраахвотным. Сабралі ўсяго 1424 анкеты, што складае 50 проц. студэнтаў БДУ.

Каго мы чытаем

Сяброўскі шарж.



А. Бязыменскі

Некаторыя студэнты скэптычна адносіліся спачатку да запаўненьня анкеты, матывіруючы гэта тым, што зараз наогул вядзецца барацьба супроць „анкетнай гарачкі". Тым ня менш, мы маем **сур'ёзныя адносіны да запаўненьня анкеты і сабраны матар'ял прадстаўляе сабой значную цікавасьць.**

Якасны склад запоўніўшых анкет наступны: па полу—68,8 проц. мужчын і 32,3 проц. жанчын. По партыйнасьці: членаў і кандыдатаў КПБ—15,3 пр., ЛКСМБ—22,7 проц. астатнія—беспартыйныя. Па соцыяльнаму становішчу больш усяго служачых.

Спынімся на некаторых пытаньнях анкет і адказах студэнцтва на іх.

* * *

Асноўным пытаньнем зьяўляецца **матар'яльнае становішча студэнтаў**, якое па гэты дзень вымушае жадаць шмат лепшага.

Частка студэнцтва аднучасова і займаецца і служыць, што адымае ў іх шмат часу і ня можа не адбівацца адмоўна на вучобе. **Большая-ж частка студэнцтва жыве на стыпэндыі (19 руб. у месяц) і на сродкі выпадковых заработкаў.** Невялічкі процант жыве на сродкі бацькоў.

Студэнты БДУ праводзяць **„зьверскі рэжым эканоміі"** у сваім бюджэце. Шмат хто з іх **рэгулярна ня прымае гарачага сьнеданьня ці не абедае штодзённа.**

Становішча студэнта ня можа не адбівацца на яго працаздольнасьці. **Цяжкія матар'яльныя і кватэрныя ўмовы, дрэннае пітаньне ды інш. падрываюць здароўе моладзі.** Сярод студэнтаў—**60 процантаў хворых.**

Амаль увесь бюджэт студэнта ўходзіць на яду і кватэру, зусім нязначны лік грошай расходуецца на **культурныя патрэбы.**

З гэтай прычыны **студэнцтва мала выпісвае газэты, рэдка наведвае тэатры і кіно.**

Нягледзячы на перагружанасьць і цяжкое матар'яльнае становішча, студэнцтва праводзіць значную грамадзкую работу, як у горадзе ў якасьці ліквідатараў няпісьменнасьці, кіраўнікоў гурткоў і г. д., так і ў вёсцы ў часе летніх вакацый.

Сталы ўдзел у грамадзкай працы прымае **40,9 проц. студэнтаў, несыстэматычны—27,3 проц.**

Некаторыя таварышы кідалі грамадзкую работу **з прычыны цяжкага матар'яльнага становішча.**

* * *

Настрой студэнцтва ў асноўным здаровы, але ёсьць у некаторых і ўпадніцкія тэндэнцыі: „...Няма рэволюцыйнага ўздыму, няма энтузіязму 1917, 18 і 20-х гадоў...", „...Не хапае энэргіі, прытупілася зусім..." і г. д.

Такіх таварышоў ня шмат, іх можна пералічыць па пальцам, але ўсё-ж такі на гэтым факце трэба завастрыць нашу ўвагу.

* * *

Некалькі часу таму назад матар'яльнае становішча студэнтаў было яшчэ горш чым зараз, але яно паступова паляпшаецца, хаця яшчэ далёка да неабходнага мінімума.

Ва ўнівэрсытэце шырока разгорнута культурная работа, але пры маючымся ліку студэнцтва, дзеля магчымасьці ахапіць яго шырокія колы—неабходзен канцэнтруючы цэнтр—унівэрсытэцкі клюб.

Беларуская савецкая грамадзкасьць удзяляе шмат увагі жыцьцю і працы пролетарскага студэнцтва БДУ; з яе дапамогай усе адмоўныя моманты студэнцкага быту будуць зьнішчаны!

З—р.

Сярод студэнцтва.

— У сучасны момант у Менску праходзіць справаздачная кампанія ЦБ Пролетстуду перад студэнтамі ВНУ, тэхнікумаў і рабфакаў. Кампанія праходзіць пад кутом выкананьня дырэктыў 4-й усебеларускай конфэрэнцыі студэнцтва і другога пленуму ЦБ Пролетстуду.

— 15-га чэрвеня ў БДУ заканчваецца залікавая сэсія, пасьля чаго студэнцтва раз'яжджаецца на вакацыі да восені.

— Выпуск пэдагогічнага факультэту БДУ адбудзецца 20 чэрвеня. Выпуск мэдфаку адкладзены на восень гэтага году.

— Закончылася мэдыцынскае абсьледваньне студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў і распачата пасылка хворых студэнтаў на курорт. Ужо паслана першая партыя хворых у Крым з БДУ і Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

— Распрацованы і ўносіцца на зацьверджаньне ЦСПСБ, Наркамасьветы і Саўнаркому проэкт аб організацыі ў БССР камітэту па паляпшэньню быту студэнцтва.

— У сучасны момант назіраецца вялікае імкненьне студэнцтва да экскурсіяў і наогул да турызму. Па ініцыятыве студэнцтва намечаны паездкі па Дняпру (на лодках), у Крым, Каўказ і г. д. ЦБ і Выканбюро пролетстуду забясьпечваюць экскурсантаў дармовымі літарамі, матар'яльнай дапамогай і інш.

Памяці М. Багдановіча

Інбелкульт зараз праводзіць работу па ўшанаваньню памяці пісьменьніка Максіма Багдановіча, які памер 10 гадоў назад—у маі 1917 г.

Па культурным установам наладжваюцца ўрачыстыя пасяджэньні з дакладамі аб творчасьці поэты і яго месцы ў беларускай літаратуры.

Гэтымі днямі выходзіць з друку поўны збор твораў Багдановіча памерам у 30 друкаваных аркушаў.

Да дому, дзе нарадзіўся Багдановіч, будзе прыбіта мармурная дошка з надпісам аб дню нараджэньні і сьмерці поэты.

Сярод пісьменьнікаў.

— **Якуб Колас** зараз працуе над аповесьцю **„У глыбі Палесься"** (другая частка „У Палескай Глушы") і над поэмай **„На шляхох волі".** Выходзяць з друку другім выданьнем яго творы— **„Новая зямля"** і **„У ціхай вадзе".** Таксама здадзена Коласам **у друк кніжка дзіцячых казак.**

— **Янка Купала** здаў у БДВ чацьверты том сваіх твораў, у які ўвайшлі драматычныя поэмы. Зараз Купала працуе над **перакладамі з украінскай поэзіі на беларускую мову.**

— **М. Грамыка** працуе над романам у вершах пад назвай „Барацьбіада" які павінен, згодна думцы пісьменьніка, адбіць сучаснае жыцьцё.

— Вышаў з друку **чацьверты нумар часопісі „Маладняк"** і знаходзіцца ў друку нумар пяты, які выйдзе гэтымі днямі.

— **Е. Барычэўскі** напісаў кнігу **«Поэтыка літаратурных жанраў»**, якая гэтымі днямі выходзіць з друку ў выданьні БДВ.

СУД.

„Тройца".

Бугарэвічу Ільле—26 гадоў. Гаркушу—28... 3-ці гэрой—малады, поўны сіл, хлапчук Жукаў—22 гадоў.

У адзін прыгожы дзень уся гэтая «тройца» сабралася ў кватэры Бугарэвіча, па вуліцы Дзяржынскага, дом № 24 (Менск).

Тут у іх адбылося «оргнізацыйнае пасяджэньне»... Яны парашылі «дзейнічаць»... Разьмеркавалі абавязкі...

Спрытнаму Жукаву было даручана здабыць ключ да замка ад кладавой інваліднага дому Зах. Чыгункі.

«Дзейнічаць» умовіліся 25-га лістапада.

І вось ўвечары гэтага дню ўсе трое, надзарона азіраючыся на бакох, зышліся на рагу вуліцы Дзяржынскага і Маскоўскай. Тут яны аб чымсьці ціхонька пагутарылі. Жукаў перадаў Бугарэвічу ключ і сказаў, што вакно дому ўжо адчынена... Адным словам, усё гатова...

Бугарэвіч улез у дом, прашоў у калідор, дзе знаходзілася кладавая, адчыніў замок, забраў усе рэчы і праз вакно перадаў на двор чакаўшым сябрам Жукаву і Гаркушу. Усяго было забрана рэчаў **на 397 рублёў.**

Частку рэчаў Бугарэвіч прадаў на Віленскім і Ніжнім базарах, частку павёз прадаваць у Слуцк.

4-га сьнежня мінулага году Менскі крымвышук атрымаў тэрміновую адносіну ад Слуцкага крымвышуку аб тым, што там затрыман Бугарэвіч з рэчамі інваліднага дому. Рэчы спазнаны па спэцыяльнаму клейму Зах. чыгункі.

Бугарэвіч на допыту ва ўсім прызнаўся.

Толькі нядаўна 3 малайцы прадсталі перад судом. Яны прызналіся ў зробленым злачынку.

Менскі акруговы суд прыгаварыў іх к 3-м гадам пазбаўленьня волі. Але прымаючы пад увагу першую судзімасьць Гаркуша і Жукава і іх інваліднасьць, суд залічыў гэтую кару ўмоўнай.

Р. Г-н.

Адказы чытачам.

Пуноўскай і Чорнай (№ 958). Фармацэўтычны тэхнікум ужо існуе ў Магілеве, куды трэба пасылаць заяву аб уступленьні.

Ім-жа (№ 959). Скончыўшыя сямігодку ў 1925-26 навучальным годзе, пры ўступленьні ў тэхнікум трымаюць іспыты па матэматыцы, грамадазнаўству, фізыцы і белмове. Скончыўшыя сямігодку ў 26-27 годзе пры ўступленьні ў тэхнікум ад іспытаў аслабаняюцца.

Вярбіцкаму (№ 960). Схадзі на пошту, дзе падпісаўся на **«Чырвоную Зьмену»**, і дай там больш падрабязны адрас, тады ніякіх памылак з прысылкай ня будзе.

Яму-ж (№ 961). Трактар цяпер каштуе каля 2 тысяч рублёў.

Яму-ж (№ 962). У сямігодках вучням дзяржаўную стыпэндыю ня выдаюць.

Крывое люстра

Сэкратару сумна...

Менская комсамольская ячэйка працаўнікоў мастацтва сьвяткуе гадавіну свайго існаваньня. Сэкратар ячэйкі вярнуўшыся дахаты пасьля працы, узяў са стала вялікую папку, у якую былі ўшыты ўсе дасягненьні і недахопы ячэйкі, сеўшы за стол пачаў чытаць. Прагледзеў дасягненьні—ухмыльнуўся: ёсьць чым пахваліцца! Але толькі зірнуў ён у аддзел недахопаў, як зразу зрабіўся сумным...

. . . .

Тав. Левін, комсамолец з 1923 году, сябра мясцовага камітэту Белдзяржкіно, працуе ў кіно **„Культура".**

Павінен быў тав. Левін праводзіць сярод служачых кіно „Культура" культурную працу. Але яму не да гэтага... Што там культурная праца, культурная праца—абрыдла ўсё гэта... І раптам ён выкінуць „амэрыканскі трук".

Склаў верш:

„Курица не птица,
Фельдшерица не девица,
Барабанщик не музыкант".

Паставіўшы кропку ў канцы гэтага дзіўнага твору, ён прабраўся да пачатку сэансу ў оркэстр і наклеіў твор на барабан музыкі Фрыдмо, вельмі паважанага чалавека, які ўжо 30 год працуе і мае чын гэроя працы. Наклеіў—і адышоў у бок сачыць „што будзе".

Хутка музыкі занялі свае месцы. Патух сьвет. Стары дырыжэр узмахнуў палачкай... але тут здарылася нешта нечаканае: Барабаншчык, які павінен быў весьці партыю, маўчаў. Яго сэрца аблілася крывёю, нешта падступіла да горла... За што так яго пакрыўдзілі?

Пасьля сэансу ўсе музыкі пісалі заяву ў бюро ячэйкі на тав. Левіна, бо даведаліляся што „трук" выкінуў ён. На бюро ячэйкі Левін жартаваў і сьмяяўся... Яму вынесьлі вымову, але ён усім кажа, што **„я зраблю штучку яшчэ лепш"**

* * *

Дарэмна вы думаце, што ў Менску адсутнічае „гаворачае кіно" Публіка, якая добра наведвае нашы кіно-тэатры і асабліва тая, што сядзіць недалёка ад кіно—будак, можа вас перакананць у тым, што „гаворачае кіно" у нас ужо не навіна... Дзіўна толькі тое, што праграма **гэтага „гаворачага"—вельмі аднастойная: усё „мацЬ" і „мацЬ"** і больш нічога!..

Комсамольская ячэйка працаўнікоў мастацтва ведае „тайны" менскага „гаворачага кіно". Аказваецца, што **гэта проста нашы комсамольцы—кіно-мэханікі так любяць лаяцца і прытым так голасна, што лаянка далятае ў залю...** Але гэта яшчэ ня так страшна! Хужэй тады, калі кіно-мэханікі зьяўляюцца на вуліцы і пачынаюць выказваць усю сваю „востравумнасьць"... Ідзе, напрыклад, жанчына з дзіцём на руках. Наш кіно мэханік—кепку на вочы і цэдзіць праз зубы:

— Божа мой, як гэта дзіцё напамінае маю працу!

Скрозь—рогат. А „востравумны" кіномэханік здаволен і ганарова азіраецца па бакох.

Зразумела, чаму сумна стала сэкратару ячэйкі.

Чычэ.

Бюро турызму.

З мэтай даць кірунак у працы турысцкіх груп Менскай акругі, пры Менакругкоме комсамолу ўтвараецца бюро турызму.

У тры радкі.

○ Нарада пры Наркампрацы СССР асыгнавала **113 тысяч рублёў на справу пашырэньня профтэхасьветы ў БССР.**

○ З 1-га мая ў Менску пачала выходзіць **двухтыднёвая газэта для літоўскага насельніцтва БССР.**

○ 60 тысяч рублёў сабрана дагэтуль ячэйкамі МОПР'у па БССР **у карысьць галадаючых сялян у Заходняй Беларусі.**

○ Менскі гарадзкі савет прыступіў да **праверкі зьніжэньня цэн** гандлёвымі організацыямі гораду шляхам абсьледваньня магазынаў МЦРК, Чырвонага Крыжу, Беларускага Ларка і г. д.

Коопэрацыйная парада

У нядзелю, 29-га мая ў м-ку Астрашыцкі Гарадок (памяшканьне хаты-чытальні) адбудзецца **коопэрацыйная нарада**, якую склікае рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» і Белкоопсаюз.



Піонэр—„спэц"

На менскай агульна-гарадзкой піонэрскай выстаўцы

Вялізнае памяшканьне цэнтральнага піонэрскага клюбу занята экспонатамі выстаўкі.

Ня гледзячы на кароткі тэрмін яе падрыхтоўкі (1 месяц), тут маецца цэлы шэраг **цікавых, характэрных матар'ялаў.**

У чым выяўляецца творчасьць дзяцей? Перш усяго ў **маляваньні**. Ляхаўская піонэрорганізацыя прадставіла тут шмат малюнкаў, зарысовак і портрэтаў.

Побач з няважна выкананымі работамі, ёсьць і даволі ўдалыя, прычым апошніх **большасьць**.

Некаторыя малюнкі з піонэрскага жыцьця, зарысоўкі прыроды, тыпаў і г. д., выкананыя фарбамі, як на паперы, гэтак і на дрэве, зьдзіўляюць сваёй закончанасьцю і ўдалай композіцыяй...

Зьвяртаюць на сябе ўвагу добрыя копіі портрэтаў т. т. **Сталіна, Угланава, Дзяржынскага, Мак-Мануса і поэта А. С. Пушкіна**, пісаныя алоўкам, тушшу і фарбамі.

Адчуваецца, што некаторыя з юных мастакоў уладаюць вялікімі **здольнасьцямі**. Сярод іх трэба адзначыць **піонэра Кіршэўскага**, як талянавітага, падаючага багатыя надзеі хлапца.

Далей ідуць насьценныя газэты атрадаў, прыгожа зробленыя з надворнага боку, экспонаты юнатаў у выглядзе розных кузурак, стракоз і г. д.

Але што заслугоўвае асаблівай увагі, дык гэта **творчасьць гуртка кройкі і шыцьця пры атрадзе МББ чыгункі.**

Піонэркі, якія займаюцца ў гэтым гуртку, пашылі ня цацкавыя, а **самыя сапраўдныя кашулі, навалачкі, салфэткі і г. д., тонкай работы і з прыгожымі ўзорамі, якія нават спэцу-швэйніку было-б ня сорамна выдаць за свае!**

Адзначым яшчэ **работы пераплётнага гуртка** у выглядзе добра перапленых кніг, нішто сабе зробленую **мадэль самалёту і нарэшце працы Ляхаўскай сталярнай майстэрні.** Сярод апошніх маюцца сталы, зэдлікі, габінэтная шафа і некаторыя іншыя рэчы.

* * *

Пры ўсіх сваіх дадатніх бакох, выстаўка мае і адмоўныя. Мы ўжо адзначалі «засилие» Ляхаўскай піонэрорганізацыі, якая адна дала больш паловы экспанатаў, Астатнія раёны — Гарадзкі і Акцябрскі—прадстаўлены адносна слаба

Праца некаторых атрадных гурткоў, як радыё і інш., чамусьці зусім не прадстаўлена. Мала мадэляў.

Выстаўка, бязумоўна, сьведчыць аб вялізным кроку ўперад менскіх піонэраў, асабліва **Ляхаўскай організацыі**

Кожны, хто быў на выстаўцы, на запытаньне—ці выхоўвае піонэрорганізацыя карысных грамадзян, людзей з працоўнымі навыкамі, адкажа станоўча.

З.



Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 2 друкарня БДВ.